*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

14 КРАСАВІКА 2007 г. СУБОТА

№ 71 (25936)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## «ШТУРМ» ВНУ ПАЧЫНАЕЦЦА З РЭГІСТРАЦЫІ НА ЦТ...

**2 мая ў Беларусі распачнецца рэгістрацыя ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання. Варта нагадаць, што абітурыенты, якія паступаюць у ССНУ на базе агульнай сярэдняй адукацыі, здаюць на цэнтралізаваным тэсціраванні дзве дысцыпліны: беларускую (рускую) мову і свой профільны прадмет. А вось абітурыентам ВНУ дадзена права праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне тройчы: маюцца на ўвазе абавязковы экзамен па адной з двух дзяржаўных моў і дзве профільныя дысцыпліны.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як паведамілі журналісту «Звязды» ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў, днямі быў зацверджаны пералік пунктаў, дзе абітурыенты змогуць зарэгістравацца і атрымаць пропуск на цэнтралізаваны тэст-экзамен.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## ДЭПУТАТЫ ПРАВЕРЫЛІ БОЕГАТОЎНАСЦЬ — СВАЮ І АРМІІ

**У чацвер дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі вывучалі вынікі ваеннага будаўніцтва за 2001—2006 гады і перспектывы далейшага ўдасканалення Узброеных Сіл нашай краіны. Пабачанае і пачутае, адзначыў старшыня ніжняй палаты беларускага парламента Уладзімір Канаплёў, пераканала, што Узброеныя Сілы Беларусі адпавядаюць сучасным патрабаванням і гатовы выконваць самыя складаныя задачы па забеспячэнню бяспекі краіны.**

Спярша парламентарыям паказалі дэманстрацыйныя палёты авіяцыі ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны, затым азнаёмілі з парадкам правядзення заняткаў з курсантамі Ваеннай акадэміі на палігоне «Белая лужа». Жадаючыя маглі стрэліць не толькі з пісталета і вінтоўкі, але і з кулямёта і нават гранатамёта. Падвёў вынік стрэльбаў У. Канаплёў: дэпутаты прадэманстравалі добры ўзровень боегатоўнасці, прычым не толькі мужчыны, але і жанчыны.

Не меншую цікавасць выклікала і тэарэтычная частка, у прыватнасці, выступленне міністра абароны Леаніда Мальцава. Паводле слоў, на палітыку Беларусі, што заснаваная на абароне нацыянальных інтарэсаў, аказваецца знешні ціск. І хоць непасрэдная пагроза развязвання вайны адсутнічае, сама ваенная небяспека захоўваецца. Таму задача беларускіх Узброеных Сіл заключаецца ў тым, каб гэта небяспека не перарасла ў рэальную ваенную пагрозу дзяржаве, якая на апошнім этапе можа перайсці ў вайну. Вайну ж у сучасных умовах, упэўнены Л. Мальцаў, можна выйграць нават без адзінага стрэлу. Сродкі інфармацыі ўжо дасягнулі такога развіцця, што могуць вырашаць мэты вайны. Цяпер «зброя масавага ўздзеяння» становіцца не менш эфектыўнай за звычайную ваенную зброю.

Незалежнасць Беларусі самым непасрэдным чынам уплывае на ход ваенных рэформаў. Суверэнітэт азначае, лічыць Л. Мальцаў, што ўсе свае праблемы мы павінны вырашаць самі, няхай і з дапамогай саюзнікаў. Такая пазіцыя фарміруе новае разуменне ролі арміі. Узброеныя Сілы цяпер — гэта ў першую чаргу не інструмент вядзення вайны, а важны фактар яе недапушчэння. Філасофія прызначэння Узброеных Сіл Беларусі заключаецца ў тым, падсумаваў Л. Мальцаў, каб «сваёй баявой магутнасцю і гатоўнасцю забяспечваць галоўныя ўмовы пасяховага сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы, яе бяспеку, суверэнітэт і мір для нашых грамадзян». Паводле яго слоў, «мы зрабілі ўсё, каб беларуская армія адпавядала гэтаму прызначэнню». І пасля яе рэфармавання можна назіраць усе элементы Узброеных Сіл незалежнай дзяржавы.

Станоўчым Л. Мальцаў назваў тое, што падчас рэфармавання арміі ў нашай краіне не адмовіліся ад тэрміновай ваеннай службы. Гэта было зроблена таму, што тэрміновая служба — адна з асноўных формаў падрыхтоўкі спецыялістаў запасу. Вайну выйграе не армія, а народ, а таму, лічыць міністр абароны, ён павінен быць гатовым пастаяць за сябе. Паводле слоў Л. Мальцава, «мы нікога ў армію не забіраем. Мы забяспечваем магчымасць маладому чалавеку навучыцца выконваць свой канстытуцыйны абавязак, каб ён мог абараніць самога сябе, сваю сям'ю».

Як вядома, цяперашняя працягласць тэрміновай службы — 18 месяцаў. Аднак у будучым яна можа паменшыцца. Паводле слоў Л. Мальцава, цяпер ідзе ўзгадненне законапраекта, у якім працягласць тэрміновай службы складзе 12 месяцаў. Асобы з вышэйшай адукацыяй ужо цяпер у арміі служаць адзін год, тыя, хто скончыў ваенны факультэт, — 6 месяцаў. У перспектыве могуць паменшыцца і гэтыя тэрміны: для першых да 9 месяцаў, а другія ўвогуле змогуць абысціся без тэрміновай службы. Што датычыцца праходжання службы па кантракту, то па ім будуць служыць тры катэгорыі грамадзян. Па-першае, гэта тыя, чыю спецыяльнасць можна падрыхтаваць на грамадзянцы, — повары, вадзіцелі. Па-другое, па кантракту будуць служыць асобы, спецыяльнасці якіх нельга асвоіць за тэрміновую службу. Па-трэцяе, ёсць вайсковыя часці, дзе салдат мала, а таму ўтрымліваць іх на поўным дзяржаўным забеспячэнні эканамічна неэфектыўна. Яшчэ адзін від службы — служба ў рэзерве. Паводле слоў Л. Мальцава, яна не саступае, а па некаторых параметрах і лепшая за тэрміновую службу. Службу ў рэзерве праходзяць, як правіла, асобы з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія тэрміновую службу праходзяць рэдка. Атрымалася, лічыць міністр абароны, «не тое што нядрэнна, а вельмі добра». Паводле слоў Л. Мальцава, узровень падрыхтоўкі вайскоўцаў запасу не павінен саступаць падрыхтоўцы кадравых вайскоўцаў. Так, з 1 чэрвеня пачне працаваць Гродзенскі тэрытарыяльны цэнтр падрыхтоўкі вайскоўцаў, рэзервістаў, ваеннаабавязаных, малодшых камандзіраў і афіцэраў запаса з выкарыстаннем навучальнай базы Гродзенскага гарнізона і ваеннага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пазней такія ж цэнтры будуць створаны і ва ўсіх іншых рэгіёнах краіны.

Л. Мальцаў таксама адзначыў, што цяпер ва Узброеных Сілах Беларусі адмовіліся ад выніковых праверак, хоць раней іх было нават дзве. У выніку праверкі сталі праводзіцца выбарачна, а аб іх правядзенні ў вайсковых часцях загадзя не становіцца вядома. Такім чынам, адзначыў міністр абароны, «ідэю аб тым, што войска павінна быць гатова ў любы момант, мы пераклалі на практыку». Станоўча характарызуецца і сістэма правапарадку ў войсках. Міністр абароны адзначыў, што каэфіцыент злачыннасці на тысячу чалавек у 2005 годзе склаў 5,4, а летась — 4,2 (для параўнання ў 2004 годзе — 10,9, а ў Расіі — 16,7).

Паводле слоў Л. Мальцава, здабыткам гісторыі стаў той факт, што з краін СНД менавіта Беларусь «надзейна забяспечвае для сваіх грамадзян мір, стабільнасць і бяспеку».

**Сяргей КАРАЛЕВІЧ.**

## Радаўніца род мацуе



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхары вёскі Лука Столінскага раёна ўпрыгожваюць прыдарожны крыж перад святамі.

## Прэм'ер-міністр Беларусі зрабіў рабочы візіт у Санкт-Пецярбург

**Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі вярнуўся ў Мінск. 12 красавіка ён пабываў з аднадзённым рабочым візітам у Санкт-Пецярбургу.**

На сустрэчы губернатора Санкт-Пецярбурга Валянціны Мацвіенка і прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага было адзначана, што Санкт-Пецярбург зацікаўлены ў набыцці беларускіх тралейбусаў, ліфтаў, дарожнай і камунальнай тэхнікі, аўтамабіляў, аўтобусаў. Губернатар выказала зацікаўленасць у набыцці беларускай сельгаспрадукцыі, у прыватнасці, жыта, а таксама цукру. Закраналіся на сустрэчы і перспектывы супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы, у тым ліку ў галіне адукацыі, спорту, турызму. Бакі дамовіліся аб правядзенні першага пасяджэння Савета дзелавога супрацоўніцтва Беларусі і Санкт-Пецярбурга ў рамках Беларускага прамысловага форуму 15—18 мая гэтага года ў Мінску. У 2008 годзе пройдуць Дні Санкт-Пецярбурга ў Беларусі.

**Людміла САЦ, БЕЛТА.**

## Вырашэнне пытання аб ільготах будзе заснавана на прынцыпе сацыяльнай справядлівасці

**Пытанне ўпарадкавання льгот — вельмі складанае, яно патрабуе сур'ёзнай ацэнкі па ўсіх пазіцыях і па ўсіх катэгорыях ільготнікаў. Аб гэтым паведаміў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандр Косінец.**

Ён адзначыў, што неабходны дасканалы аналіз ільгот, што прадастаўляюцца ў рэспубліцы. Пытанне іх упарадкавання будзе вырашацца ў кантэксце рэалізуемай у краіне сацыяльнай палітыкі.

«Нашы людзі павінны бачыць і адчуваць клопат дзяржавы, для гэтага будуць задзейнічаны ўсе магчымасці і рэсурсы, — падкрэсліў Аляксандр Косінец. — Асноўны падыход пры вырашэнні пытання аб ільготах — сацыяльная справядлівасць». Усе нюансы, што датычацца перагляду льготных пазіцый, будуць максімальна поўна асвятляцца ў сродках масавай інфармацыі. Такім чынам, будзе забяспечана галоснасць у гэтым пытанні, рэзюмаваў віцэ-прэм'ер.

**Алена ПРУС, БЕЛТА.**

## Наведванне могілак і помнікаў у зоне радыяцыйнага адчужэння будзе дазволена 16—17 красавіка

**Месцы пахавання ў зоне радыяцыйнага адчужэння і адсялення будуць адкрыты 16—17 красавіка з 8.00 да 18.00. Толькі ў гэтыя дні для ўезду на забруджаную тэрыторыю не спатрэбяцца спецыяльныя пропускі.**

Як паведаміў начальнік адміністрацыі зоны радыяцыйнага адчужэння і адсялення Гомельскай і Магілёўскай абласцей Юрый Кузьміч, традыцыйна на Радаўніцу ўводзіцца свабодны рэжым наведвання тэрыторыі павышанага радыяцыйнага забруджвання. Аднак тыя, хто ўязджае, могуць знаходзіцца толькі каля месцаў пахавання родных і блізкіх. Свабоднае перамяшчэнне па зоне забаронена, удакладніў субяседнік. Гэта будзе кантралявацца спецыяльнымі рэйдавымі патрулямі. Юрый Кузьміч дадаў, што на тэрыторыі зоны адчужэння налічваецца больш як 290 могілак.

**Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.**

## НА РАДАЎНІЦУ БУДЗЕ СОНЕЧНА І ЦЁПЛА

**У бліжэйшыя дні вырашальны ўплыў на надвор'е ў нашай краіне будзе аказваць Скандынаўскі антыцыклон, які рухаецца зараз у бок Польшчы.**

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава, сёння ўдзень пад уплывам атмасфернага фронту ў Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і на ўсходзе Мінскай абласцей пройдуць невялікія дажджы. Тэмпература паветра ўдзень у суботу—нядзелю — 8—14 градусаў, па паўднёваму захаду — да 18 цяпла.

У панядзелак і на Радаўніцу чакаецца сонечнае і цёплае надвор'е. Тэмпература паветра ўдзень 16—17 красавіка — 12—18 градусаў, а ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях — да 20. Уначы ў гэтыя дні будзе яшчэ халаднавата — ад мінус 2 да 5 градусаў цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## 17 ШКОЛЬНІКАЎ ПАЦЯРПЕЛІ АД «ШОКУ»

**Пад вечар у чацвер школьнікі мінскай сярэдняй школы забаўляліся з газавым балончыкам: свавольства дзяцей прывяло да нежартоўных вынікаў.**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» супрацоўнік прэс-службы ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр Ластоўскі, здарэнне адбылося каля пяці гадзін вечара ў будынку школы па вуліцы Я. Лучыны.

Усе падрабязнасці гэтага інцыдэнту зараз высвятляюцца следчымі Ленінскага РУУС сталіцы, аднак некаторыя акалічнасці ўжо вядомыя.

У прыватнасці, паводле папярэдняй інфармацыі, на другім паверсе школы вучні сёмага класа распылілі слёзацечны газ тыпу «Шок». Іх «нявінны жарт» прывёў да таго, што 17 школьнікам давялося аказваць медыцынскую дапамогу. Больш за тое, 10 з пацярпелых вучняў былі змешчаны ў розныя бальніцы горада. Зноў-такі, паводле папярэдняй інфармацыі, апошнім школьнікам пастаўлены дыягназ «інгаляцыйнае атручэнне газам».

**Ігар ГРЫШЫН.**

## НЕМАЎЛЯ ЗНАЙШЛІ ЖЫВЫМ І ВЫРАТАВАЛІ

**10 красавіка ўначы ў Магілёўскую гарадскую бальніцу «хуткая дапамога» прывезла 22-гадовую жанчыну з падазрэннем на выкідыш. Пасля агляду медыкі вырашылі, што жанчына нядаўна нарадзіла дзіця, але пацыентка гэта катэгарычна адмаўляла.**

Супрацоўнікі міліцыі сталі шукаць нованароджанае дзіця ў жанчыны дома. У вялікім прыватным доме зрабіць гэта было вельмі няпроста, а лік ішоў на хвіліны. І ўсё ж у выніку немаўля знайшлі ў летняй кухні на падлозе ў кучы рыззя. І маленькі хлопчык быў жывы! Жанчыне-міліцыянеру давялося нават пупок перавязаць. Гэтым часам, дарэчы, прачнуўся грамадзянскі муж жанчыны, які і не ведаў, што тая нарадзіла дзіця.

У бальніцы немаўля выхадзілі. Медыкі гавораць, што адаптацыйныя магчымасці яго арганізма аказаліся добрыя, і з хлопчыкам цяпер усё ў парадку. Толькі ці вернецца да яго маці? Гэта будзе вырашаць суд, дзе будзе слухацца справа аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў жанчыны.

Сама яна цяпер плача і гаворыць, што зробіць усё, каб вярнуць сына. А хлопчыка назвалі ў бальніцы Вовам — у гонар міліцыянера, які яго знайшоў і тым самым выратаваў яму жыццё.

**Алена КАЗЛОВА.**

## ВЫПЛАТА ПЕНСІЙ ЗА ВЫХАДНЫЯ І СВЯТОЧНЫЯ ДНІ ПАЧНЕЦЦА РАНЕЙ

**У сувязі з пераносам рабочых дзён з 16 красавіка на 14 красавіка і з 30 красавіка на 5 мая гэтага года, а таксама са святкаваннем Радаўніцы і 1 Мая графік выплаты пенсій падкарэктаваны.**

Як паведаміла начальнік упраўлення паштовых тэхналогій і лагістыкі РУП «Белпошта» Валянціна Маліноўская, у сельскай мясцовасці выплата пенсій за 15, 16 і 17 красавіка будзе праведзена напярэдадні — у суботу 14 красавіка. Паколькі гарадскія аддзяленні сувязі будуць працаваць у панядзелак 16 красавіка, то менавіта ў гэты дзень адбудзецца выплата пенсій за 16 і 17 красавіка. Паводле слоў спецыяліста, пенсіі за 1 мая будуць выплачаны на дзень раней — 30 красавіка. «Па графіку выплата пенсій у рэспубліцы з першага дня месяца пачынаецца толькі ў горадзе Мінску і Віцебскай вобласці (у астатніх рэгіёнах — на некалькі дзён пазней), — праінфармавала Валянціна Маліноўская. — Таму змяненне тэрмінаў выплаты пенсій за 1 мая закране толькі нязначную колькасць атрымальнікаў пенсій».

**Алена ПРУС, БЕЛТА.**

## ЗАТРЫМАНЫ НАРКАДЗЯЛОК

**Сталічным праваахоўнікам у ходзе дэталёва распрацаванай аперацыі ўдалося канфіскаваць буйную партыю псіхатропнага рэчыва ў гэтым годзе — паводле самых сціплых падлікаў, на суму больш за 16 тысяч долараў ЗША.**

Гэта псіхатропнае рэчыва канкрэтны «бізнэсмен» завозіў партыямі ад 100 да 200 грамаў. Потым тавар дробным оптам здаваўся распаўсюджвальнікам. Быў выяўлены канал пастаўкі амфетаміну. У Гродне затрымалі мясцовага жыхара. У яго кватэры пры вобыску было канфіскавана 800 грамаў амфетаміну.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

20 красавіка 2007 г. у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу сёмая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

## НІХТО НЕ ЦЭНІЦЬ ЖЫЦЦЁ ТАК, ЯК ЯНЫ

— маленькія пацыенты Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра дзіцячай анкалогіі і гематалогіі ў Бараўлянах, дзе нядаўна наладзілі свята: прэзентацыю зборніка іх уласных твораў «Бераг надзеі» — вершаў, апавяданняў, казак. Яны пішуць зусім недзіцячыя вершы, але не губляюць пры гэтым непаўторнай дзіцячай непасрэднасці. Васьмігадовы Максім Марцінчык пісаў свае казкі ў аддзяленні трансплантацыі коснага мозгу, — там, дзе маленькі пацыент знаходзіцца адзін, без бацькоў, у стэрыльных умовах — і падчас аднаго з наведванняў Максімка сказаў вельмі ветліва і абсалютна сур'ёзна:

— Я, вядома ж, вельмі рады, што вы прыйшлі, але вы мне крыху перашкаджаеце — я ж пішу!

Такі вось смех — скрозь слёзы...

Упэўнена, гэтыя дзеці жывуць больш поўным і насычаным жыццём, чым мы з вамі, і ведаеце, чаму? Таму што яны па-сапраўднаму цэняць яго — кожнае імгненне! Многім аўтарам гэтага і іншых падобных зборнікаў пашчасціла вырасці, яны пераведзены на ўлік у дарослыя цэнтры, як, напрыклад, 23-гадовы Саша Бенедзіктовіч:

— Мне, пэўна, было яшчэ больш складана, бо захварэў я ў дарослым узросце — у 17 гадоў, калі вучыўся ў 11-м класе, і я ўсведамляў, што мне пагражае. Калі трапляеш сюды, жыццёвыя прыярытэты рэзка змяняюцца — усе дробязі адыходзяць на другі план, адшукваеш самае-самае важнае ў жыцці. Ідзе пошук падтрымкі, нават не столькі ў іншых людзях, колькі ў самім сабе, каб проста не зламацца.

У Цэнтры Саша правёў паўтара года. Некаторыя яго вершы былі пакладзены на музыку і выкананы беларускім бардам Лазарам Віткіным. Пэўны час хлопец захапляўся яшчэ і маляваннем. «Бераг надзеі» — чацвёрты па ліку зборнік, а ў першых ледзь не палову складалі менавіта Сашыны вершы. Зараз ён наведвае цэнтр нячаста — выключна на прэзентацыі прыходзіць, рыхтуецца да паступлення ў эканамічны ўніверсітэт. Саша кажа, што сяброў у яго няшмат: «Мая асноўная падтрымка — гэта я...», — без ценю крыўды кажа малады чалавек. Аднак, нягледзячы на гэта, ён прызнае, што візіты ў цэнтр — гэта неабходная псіхалагічная дапамога для маленькіх пацыентаў.

Гэтую ж думку выказаў і Вова Ганчароў — сімпатычны і вельмі прыемны ў размове хлопец — само ўвасабленне адоранасці: Вова спявае ўласныя песні (ён аўтар і музыкі, і тэкстаў) і акампануе сабе на гітары. Для нас ён выканаў па-беларуску песню «Краіна». У цэнтр хлопец прыходзіць таму, што лепш чым хто-небудзь разумее: тут ёсць людзі, якім патрэбна дапамога, як калісьці яна была патрэбна яму самому. Вова правёў тут літаральна ўсё сваё жыццё, трапіўшы сюды ў гадавалым узросце. Зараз яму 19, як складваецца яго жыццё цяпер?

— Я пішу вершы, музыку, займаюся ў спартыўнай зале і ... гуляю з дзяўчынамі! — кажа Вова і ўсміхаецца вельмі шчыра і цёпла.

Прыемна, што мне выпаў шанц павіншаваць студэнта ветэрынарнай акадэміі — Вова ўжо датэрмінова пераведзены на 2-і курс:

— Якраз учора здаў апошні экзамен датэрміновай сесіі. Усё здорава!

Вова ўжо па-за цэнтрам. На пытанне, ці адолеў хваробу, адказвае так:

— Не ведаю, як наконт адолеў, але спыніць — спыніў!

Калі я бядую наконт таго, што лячэнне доўжылася 18 гадоў, Саша кажа: «Нічога, выцягнем!» — і, ведаеце, я яму веру! Мяне ўражвае яго аптымізм і жыццярадаснасць.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## «ЖСК «БЕЛМЕДПРЕПАРАТЫ-ЖИЛЬЕ» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С КУП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

повторно проводят открытый аукцион по продаже **встроенных помещений жилого дома, расположенного в г. Минске по ул. Полевая, 6:**

Лот №1 – **игровая с тамбуром.** Общая площадь – 68,81 кв.м. Начальная цена снижена и составляет 173 340 000 рублей без учета НДС.

Лот №2 – **помещение для администрации ЖСК.** Общая площадь – 110,0 кв. м. Начальная цена снижена и составляет – 277 020 000 рублей без учета НДС.

По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа. Задаток в размере 10 процентов от начальной цены лота перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Договор купли-продажи между продавцом и покупателем заключается в течение 10 дней с даты проведения аукциона. **Аукцион состоится 27 апреля 2007 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.** Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 26 апреля 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 09.12.2006.

**Телефоны для справок: 227-48-36, 221-53-48».**

## КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

проводит открытый аукцион по продаже обращенного в доход государства здания бытовых помещений цеха РТИ общей пл. 632,7 кв.м, расположенного по адресу: г. Копыль, ул. Партизанская, д. 32. Начальная цена – 204 738 000 рублей. Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «Белпромстройбанк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объект продается без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению райисполкома на основании заявления победителя аукциона. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 15.05.2007 г. в 14.30 по адресу: г. Копыль, площадь Ленина, д. 6, актовый зал Копыльского райисполкома. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 14.05.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 322.

**Контактный телефон (8-017) 224-61-34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

## БЕЛАРУСБАНК

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 АПРЕЛЯ 2007 ГОДА ОАО СБЕРЕГАТЕЛЬНЫЙ БАНК «БЕЛАРУСБАНК»

*в миллионах белорусских рублей*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2007 г. | 2006 г. |
|---|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* | *5* |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 272600,1 | 194353,0 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 576484,0 | 395737,2 |
| 4 | Ценные бумаги:<br>для торговли<br>удерживаемые до погашения<br>в наличии для продажи | 1103<br>11031<br>11032<br>11033 | 1015878,8<br>-<br>57099,5<br>958779,3 | 772935,2<br>-<br>123889,2<br>649046,0 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 517261,2 | 219638,7 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 10292056,0 | 6361571,3 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 101398,8 | 23944,9 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 407509,3 | 301646,1 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 345374,1 | 137560,8 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | 13528562,3 | 8407387,2 |
| 11 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 483438,5 | 153372,9 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 927512,2 | 509914,1 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 9496672,4 | 5939359,8 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 97701,8 | 74591,1 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 619531,4 | 261374,3 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 11624856,3 | 6938612,2 |
| 18 | КАПИТАЛ | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 1437530,9 | 1175152,0 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 32799,5 | 22730,8 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 241394,6 | 131629,7 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 191981,0 | 139262,5 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 1903706,0 | 1468775,0 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 13528562,3 | 8407387,2 |
| 26 | ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 25807699,9 | 17152550,7 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 2096214,2 | 1331338,4 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ НА 1 АПРЕЛЯ 2007 ГОДА ОАО СБЕРЕГАТЕЛЬНЫЙ БАНК «БЕЛАРУСБАНК»

*в миллионах белорусских рублей*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2007 г. | 2006 г. |
|---|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* | *5* |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 293327,2 | 185724,8 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 195070,0 | 104908,9 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 98257,2 | 80815,9 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 73983,7 | 55155,6 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 7028,5 | 3943,5 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 66955,2 | 51212,1 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 24958,1 | 17601,1 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 61,1 | 79,2 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | 3,0 | 358,4 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 5586,3 | 7745,9 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 8119,7 | 10846,4 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 152178,4 | 114639,1 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 8840,4 | 8851,6 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 9433,3 | 9289,8 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 22315,9 | 20386,7 |

Председатель Правления — Н.А. Ермакова

Главный бухгалтер — И.П. Лысоковская

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.*

ISSN 1990-763X

## КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.04.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 144,00 |
| 1 еўра | 2 899,22 |
| 1 латвійскі лат | 4109,25 |
| 1 літоўскі літ | 839,62 |
| 1 чэшская крона | 103,81 |
| 1 польскі злоты | 755,16 |
| 1 расійскі рубель | 83,01 |
| 1 украінская грыўня | 428,07 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 25,8286 |
| 10 UAH | 51,0225 |
| 1000 BYR | 12,0266 |
| EUR | 34,9177 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 13.04.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2140 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

# «ШТУРМ» ВНУ ПАЧЫНАЕЦЦА З РЭГІСТРАЦЫІ НА ЦТ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Хачу звярнуць увагу маладых людзей на тую акалічнасць, што пляцовак, на базе якіх будзе праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне, асабліва ў сталіцы, значна больш, чым пунктаў рэгістрацыі. Гэта робіцца для зручнасці абітурыента, — **патлумачыў дырэктар інстытута Міхаіл Фяськоў.** — Маладым людзям не прыйдзецца бегаць у пошуках свабоднага пасадачнага месца. Пасадачнае месца ім будуць шукаць у пункце рэгістрацыі, і яно будзе ўказана ў пропуску на ЦТ. Да таго ж і нам будзе так значна прасцей раўнамерна размяркоўваць удзельнікаў тэсціравання па навучальных установах.

Для рацыянальнага выкарыстання зарэзерваванага аўдыторнага фонду я папрасіў бы абітурыентаў рэгістравацца на ўсе дысцыпліны ў адным пункце рэгістрацыі — бліжэй да іх месца жыхарства ці цяперашняй вучобы. Маладым людзям, якія плануюць паступаць у сталічныя навучальныя ўстановы, зусім неабавязкова ехаць здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне ў Мінск, паколькі месца праходжання тэсціравання ніяк не звязана з будучым выбарам маладых людзей. Тэсты для абітурыентаў ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў абсалютна раўназначныя па складанасці і ўсе ўдзельнікі атрымліваюць аднолькавыя сертыфікаты без указання месца праходжання цэнтралізаванага тэсціравання.

Пункты рэгістрацыі будуць працаваць з 8 да 20 гадзін у рабочыя дні тыдня, а таксама ва ўсе майскія суботы і ў нядзелю, 27 мая.

Для таго, каб не ствараць ажыятаж і вялізныя чэргі ў пунктах рэгістрацыі, Міхаіл Фяськоў параіў абітурыентам не бегчы рэгістравацца ўсім у першы дзень, але і не адкладваць гэту важную справу на апошні момант. Рэгістрацыя, нагадаем, завяршаецца 1 чэрвеня. Для абітурыентаў, якія па ўважлівай прычыне не змогуць трапіць на цэнтралізаванае тэсціраванне па агульнаму графіку, вызначаны адзін рэзервовы дзень — 4 ліпеня.

Перарэгістравацца на цэнтралізаванае тэсціраванне ў рэзервовы дзень можна будзе ў перыяд з 25 па 30 чэрвеня ў Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы, Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце, Беларуска-Расійскім універсітэце і Беларускім дзяржаўным універсітэце. Тэсціраванне ў рэзервовы дзень будзе праходзіць для абітурыентаў з усёй краіны ў сталіцы на базе БДУ. Здаць у рэзервовы дзень можна будзе толькі адну вучэбную дысцыпліну.

Зарэгістравацца на цэнтралізаванае тэсціраванне можна не толькі па пашпарту грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, але і па пасведчанню на правы жыхарства, а таксама па пасведчанню бежанца. Замежным грамадзянам неабавязкова асабіста прыязджаць у Беларусь, каб атрымаць пропуск на цэнтралізаванае тэсціраванне. За іх гэта могуць зрабіць, напрыклад, сваякі. Яны могуць падаць заяву ад імя абітурыента і зарэгістраваць яго для ўдзелу ў тэсціраванні на падставе ксеракопіі дакумента, які сведчыць асобу будучага ўдзельніка ЦТ. Натарыяльна ксеракопію можна не завяраць. Але прайсці цэнтралізаванае тэсціраванне можна будзе толькі маючы на руках арыгінальны дакумент, на ксеракопіі якога ажыццяўлялася рэгістрацыя. Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў дазваляе таксама зарэгістравацца замежным грамадзянам завочна, па пошце. Анкету рэгістрацыі замежных грамадзян можна знайсці на сайце інстытута (www.rikz.unibel.by). Як і шмат іншай карыснай для абітурыентаў інфармацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### *ГРАФІК ПРАВЯДЗЕННЯ ЦЭНТРАЛІЗАВАНАГА ТЭСЦІРАВАННЯ Ў 2007 ГОДЗЕ*

*Беларуская мова — 12 чэрвеня*
*Руская мова — 13 чэрвеня*
*Гісторыя Беларусі — 15 чэрвеня*
*Сусветная гісторыя навейшага часу — 17 чэрвеня*
*Матэматыка — 19 чэрвеня*
*«Чалавек. Грамадства. Дзяржава» — 21 чэрвеня*
*Геаграфія — 22 чэрвеня*
*Фізіка — 23 чэрвеня*
*Біялогія — 25 чэрвеня*
*Замежныя мовы — 27 чэрвеня*
*Хімія — 28 чэрвеня*

# ПУНКТЫ РЭГІСТРАЦЫІ ДЛЯ ЎДЗЕЛУ Ў ЦЭНТРАЛІЗАВАНЫМ ТЭСЦІРАВАННІ 2007 г.

### г. Мінск

| № п/п | Назва пункта тэсціравання | Адрас пункта рэгістрацыі | Адукацыйныя прадметы | Адрас Web-сайта |
|---|---|---|---|---|
| **1** | **Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт** | 220013, г. Мінск, вул. Якуба Коласа, 12, вучэбны корпус 8 | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, гісторыя Беларусі, ЧГД | **www.bntu.by** |
| 2 | Вышэйшы дзяржаўны каледж сувязі | | | www.vks.belpak.by |
| 3 | Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь | | | |
| 4 | Мінскі дзяржаўны гандлёвы каледж | | | www.mqtk.by |
| **5** | **Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт** | 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 4, 4-ы паверх, актавая зала | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, гісторыя Беларусі, ЧГД, геаграфія | **www.bsu.by** |
| 6 | Філіял «Індустрыяльна-педагагічны каледж» Установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі» | | | www.ipk.ripo.unibel.by |
| 7 | Міжнародны інстытут працоўных і сацыяльных адносінаў | | | |
| 8 | Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва | | | www.ipp.by |
| **9** | **Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт** | 220070, г. Мінск, Партызанскі пр., 26, вучэбны корпус 3, каб. 140 | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, гісторыя Беларусі, ЧГД | **www.bseu.by/testinq** |
| 10 | Мінскі інстытут кіравання | | | www.miu.by |
| 11 | Мінскі дзяржаўны аўтамабільны каледж | | | www.mqak.ripo.unibel.by |
| 12 | Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці | | | |
| **13** | **Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт** | 220023, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 99, корпус 2 | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, гісторыя Беларусі, ЧГД | **www.batu.edu.by** |
| 14 | Мінскі дзяржаўны політэхнічны каледж | | | |
| 15 | Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокава | | | www.isz.minsk.by |
| **16** | **Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі** | 220013, г. Мінск, вул. П. Броўкі, 4, корпус 2 | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, гісторыя Беларусі, ЧГД | **www.abitur.bsuir.unibel.by** |
| 17 | Мінскі дзяржаўны вышэйшы радыётэхнічны каледж | | | www.colleqe.unibel.by |
| 18 | Міжнародны гуманітарна-эканамічны інстытут | | | |
| **19** | **Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка** | 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18 | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, французская мова, іспанская мова, нямецкая мова, гісторыя Беларусі, ЧГД | **www.bspu/unibel.by** |
| 20 | БІП — інстытут правазнаўства | | | www.bip-ip.info |
| 21 | Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры | | | www.sportedu.by |
| 22 | Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт | | | www.bstu.unibel.by |
| **23** | **Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт** | 220034, г. Мінск, вул. Захарава, 21 | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, гісторыя Беларусі, ЧГД | **www.mslu.by** |
| 24 | Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь | | | www.academy.mia.by |
| 25 | Прыватны інстытут кіравання і прадпрымальніцтва | | | www.imb.by |
| **26** | **Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт** | 220116, г. Мінск, пр. Дзяржынскага, 83, корпус 1 | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, гісторыя Беларусі, ЧГД, сусветная гісторыя | **www.pk.bsmu.by** |
| 27 | Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь | | | www.pacademy.edu.by |
| 28 | Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў | | | |
| **29** | **Міжнародны дзяржаўны экалагічны ўніверсітэт імя А. Дз. Сахарава** | 220009, г. Мінск, вул. Далгабродская, 23 | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, гісторыя Беларусі, ЧГД | **www.iseu.by** |
| 30 | Мінскі дзяржаўны вышэйшы авіяцыйны каледж | | | www.mgvak.niks.by |
| 31 | Камандна-інжынерны інстытут Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь | | | www.kii.gov.by |
| 32 | Жаночы інстытут «ЭНВІЛА» | | | www.envila.by |

### Брэсцкая вобласць

| № п/п | Назва пункта тэсціравання | Адрас пункта рэгістрацыі | Адрас Web-сайта |
|---|---|---|---|
| 1 | Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт | 224017, г. Брэст, вул. Маскоўская, 267, корпус 2, галерэя | www.bstu.by |
| 2 | Брэсцкі дзяржаўны політэхнічны каледж | | bgpk.iatp.by |
| 3 | Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна | 224016, г. Брэст, бульвар Касманаўтаў, 21, каб. 404 | www.brsu.brest.by |
| 4 | Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт | 225409, Брэсцкая вобласць, г. Баранавічы, вул. Камсамольская, 84, корпус 2, аўд. 17 | www.barsu.by |
| 5 | Баранавіцкі тэхналагічны каледж Белкаапсаюза | | www.barsu.by |
| 6 | Палескі дзяржаўны ўніверсітэт | 225710, г. Пінск, вул. Кірава, 24, каб. 2 | www.psunbrb.by |
| 7 | Пінскі дзяржаўны індустрыяльна-педагагічны каледж | 225710, г. Пінск, вул. Іркуцка-Пінскай дывізіі, 27, каб. 103 | www.pqipk.by |

### Віцебская вобласць

| № п/п | Назва пункта тэсціравання | Адрас пункта рэгістрацыі | Адрас Web-сайта |
|---|---|---|---|
| 1 | Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт | 210035, г. Віцебск, Маскоўскі пр., 72, фае актавай залы | www.vstu.vitebsk.by |
| 2 | Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт | | www.vgmu.vitebsk.by |
| 3 | Віцебскі дзяржаўны тэхнічны каледж | | www.vgtk.vitebsk.by |
| 4 | Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны | | www.vsavm.com |
| 5 | Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава | 210038, г. Віцебск, Маскоўскі пр., 33, аўд. 119 | www.vsu.by |
| 6 | Аршанскі дзяржаўны механіка-эканамічны каледж | 211382, г. Орша, вул. Савецкая, 81, аўд. 2 | www.osmec.narod.ru |
| 7 | Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт | 211440, г. Наваполацк, вул. Блахіна, 30 (новы корпус), аўд. 21 і аўд. 35 | www.psu.by |
| 8 | Наваполацкі дзяржаўны політэхнічны тэхнікум | | www.ngpt2004.narod.ru |

### Гомельская вобласць

| № п/п | Назва пункта тэсціравання | Адрас пункта рэгістрацыі | Адрас Web-сайта |
|---|---|---|---|
| 1 | Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П.О. Сухога | 246746, г. Гомель, пр. Кастрычніка, 48, корпус 1, прыёмная камісія | www.gstu.gomel.by |
| 2 | Гомельскі дзяржаўны машынабудаўнічы тэхнікум | | www.gstu.gomel.by |
| 3 | Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны | 246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 102, корпус 5 | www.gsu.unibel. by/testing |
| 4 | Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту | 246653, г. Гомель, вул. Кірава, 34, аўд. 106 | www.belsut.gomel.by |
| 5 | Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна | 247760, г. Мазыр, вул. Студэнцкая, 28, корпус 1 | www.mgpu.gomel.by |
| 6 | Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | 246000, г. Гомель, вул. Ланге, 5, корпус 1, аўд. 111 | www.meduniver.gomel.by |
| 7 | Гомельскі інжынерны інстытут Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь | 246023, г. Гомель, Рэчыцкае шасэ, 35 а | www.gii.gomel.by |
| 8 | Мазырскі дзяржаўны політэхнічны тэхнікум | 247760, г. Мазыр, вул. Катлаўца, 23, к. 112 | www.mgpt.gomel.by |
| 9 | Светлагорскі дзяржаўны індустрыяльны тэхнікум | 247434, Гомельская вобласць, г. Светлагорск, вул. Шасэйная, 10 | www.sgit.gomel.by |
| 10 | Беларускі гандлёва-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі | 246029, г. Гомель, праспект Кастрычніка, 50, аўд. 1—4 | www.bteu.by |

### Гродзенская вобласць

| № п/п | Назва пункта тэсціравання | Адрас пункта рэгістрацыі | Адрас Web-сайта |
|---|---|---|---|
| 1 | Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы | 230023, г. Гродна, вул. Кастрычніцкая, 5, аўд. 101 | www.grsu.unibel.by |
| 2 | Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | | |
| 3 | Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт | | |
| 4 | Гродзенскі дзяржаўны політэхнічны каледж | | - |
| 5 | Лідскі тэхнічны каледж УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы» | 231300, Гродзенская вобласць, г. Ліда, вул. Савецкая, 18 | www.grsu.unibel.by |
| 6 | Ваўкавыскі дзяржаўны аграрны каледж | 231900, Гродзенская вобласць, г. Ваўкавыск, вул. Перамогі, 52 | - |

### Мінская вобласць

| № п/п | Назва пункта тэсціравання | Адрас пункта рэгістрацыі | Адрас Web-сайта |
|---|---|---|---|
| 1 | Барысаўскі дзяржаўны політэхнічны каледж | 222120, г. Барысаў, вул. Гагарына, 68 | www.bgpk.of.by |
| 2 | Маладзечанскі дзяржаўны політэхнічны каледж | 222310, г. Маладзечна, Цэнтральная плошча, 2, корп. 1, аўд. 212 | - |
| 3 | Салігорскі дзяржаўны горна-хімічны тэхнікум | 223710, Мінская вобласць, г. Салігорск, вул. Казлова, 18 | - |

### Магілёўская вобласць

| № п/п | Назва пункта тэсціравання | Адрас пункта рэгістрацыі | Адрас Web-сайта |
|---|---|---|---|
| 1 | Беларуска-Расійскі ўніверсітэт | 212005, г. Магілёў, пр. Міру, 43, корпус 1, аўд. 217 | www.rct.bru.mogilev.by |
| 2 | Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова | | www.msu.mogilev.by |
| 3 | Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання | | www.mgup.mogilev.by www.bru.mogilev.by/rct |
| 4 | Магілёўскі дзяржаўны політэхнічны каледж | | www.bru.mogilev.by/rct |
| 5 | Беларуская дзяржаўная ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчая акадэмія | 213410, г. Горкі, Магілёўская вобл., вул. Мічурына, 13, корпус 11, к. 707 | www.baa.by |
| 6 | Клімавіцкі дзяржаўны аграрны каледж | 213634, г. Клімавічы, вул. Леніна, 11 | - |
| 7 | Бабруйскі дзяржаўны аўтатранспартны каледж | 213826, г. Бабруйск, вул. Пушкіна, 145, корпус 4, аўд. 2 | www.autokollege.narod.ru |
| 8 | Бабруйскі філіял УА «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт» | | www.bfbgeu.by |

# ГЕРАІЧНАЕ ПЛЕМЯ

**«Люди мира, на минуту встаньте!..» — і пад словы вядомай песні сотні людзей, запрошаных на сустрэчу ў сталічны ДК «Аўтазаводзец», узняліся са сваіх месцаў у адзіным парыве. Адны з іх абапіраліся на палачку, другія — на спінку крэсла, трэція — на плячо таварыша. Але своеасаблівы гімн былых вязняў нацысцкіх канцлагераў яны дапелі да канца стоячы. Многія плакалі.**

Ёсць у нашым календары дата, якая ўжо больш за 60 гадоў нагадвае аб трагічных старонках Вялікай Айчыннай вайны, — гэта Міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў. Праз Асвенцім, Бухенвальд, Трэблінку, Майданэк і іншыя «кузні смерці» прайшло 18 мільёнаў чалавек, з якіх 11 мільёнаў было знішчана. Толькі на тэрыторыі Беларусі размяшчалася 220 «філіялаў» гэтай бязлітаснай «вытворчасці» — турмаў, гета і лагераў. На тэрыторыю Германіі, фактычна ў рабства, было загнана каля 400 тысяч беларускіх грамадзян...

«Магчыма, сёння яшчэ не ўсе ўсвядомілі, што ўчынялася над нашым народам у гады вайны, — сказаў, адкрываючы сустрэчу, старшыня праўлення Беларускага рэспубліканскага фонду «Узаемаразуменне і прымірэнне» Валянцін Герасімаў. — Былыя вязні нацызму — гэта таксама гераічнае племя, якое не зламалася, а выжыла — насуперак усім выпрабаванням і насіллю. Калі мы ўсвядомім гэта, не застанецца недаўмення наконт таго, чаму немцы выплачваюць ім сёння грашовую кампенсацыю».

... Яны не любяць успамінаць аб вайне, а пра жыццё ў канцлагерах расказваюць толькі на сустрэчах са школьнікамі — калі тыя папросяць. Няшмат успамінаў давялося пачуць і ў гэты вечар. Затое гучала шмат музыкі, самадзейныя калектывы радавалі запрошаных на сустрэчу песнямі і танцамі. «Так і павінна быць, — падзяліўся ўражаннямі мужчына, які сядзеў побач. — Усё ж гэта дзень радасці, а не смутку».

**Наталля КАРПЕНКА.**

# *Як радасны адказ на вечныя пытанні*

**У нядзелю, 15 красавіка, а 10-й гадзіне раніцы адкрыецца IX Міжнародны фестываль Праваслаўных Песнапенняў. Пра ўзровень падзеі кажа ўжо той факт, што сустаршынямі аргкамітэта, які ўзначальвае Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, з'яўляюцца чатыры міністры і мэр сталіцы. Але галоўны паказчык узроўню конкурсу — гэта склад удзельнікаў. Сёлета на фестывалі можна будзе пачуць і ўбачыць калектывы, трапіць на канцэрты якіх — рэдкая магчымасць.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Напрыклад, на выступленне Армянскага камернага хору, які прыязджае на спаборніцтва ў намінацыі прафесіяналаў, білетаў у Маскве не дастаць. Альбо дзе вы яшчэ пачуеце манашак-бандурыстак? Наўрад ці нават у самім жаночым манастыры ва Украіне, дзе яны жывуць. Спаборнічаць паміж сабой будуць таксама два архірэйскія хары — з Брэста і Уладзіміра-на-Клязьме (Расія). Акрамя 14 царкоўных хароў і ансамбляў у фестывалі возьмуць удзел 25 свецкіх калектываў, з іх — 5 прафесійных. У Мінск прыязджаюць госці з Расіі, Латвіі, Балгарыі, Украіны, Славакіі, Польшчы, Сербіі, Арменіі.

Дзякуючы гэтаму фестывалю 15 гадоў таму ў Беларусі ўпершыню прагучалі са сцэны праваслаўныя літургічныя песнапенні. З 1995 года фестываль робіцца трошкі іншым — цяпер гэта своеасаблівы абмен вопытам паміж царкоўнымі і свецкімі (дзіцячымі і дарослымі) харамі. Фестываль праваслаўных песнапенняў мае свае асаблівасці, для ўдзелу ў ім неабходна валодаць майстэрствам выканання старажытнага знаменнага распеву, а таксама ўжытковага песнапення, звычайна прысвечанага беларускім святым, акрамя таго, для свецкіх калектываў абавязковым з'яўляецца выкананне праваслаўнага песнапення сучаснага аўтара.

Па сутнасці, для таго фестываль і ладзіцца — каб заахвоціць рэгентаў і дырыжораў звяртацца да асноў музычна-пеўчай культуры Праваслаўнай царквы. Менавіта царкоўная музыка, лічаць знаўцы, здольная раскрыць патаемны сэнс Божага Пісання, у натхнёным імгненні пераўтварыць душу.

— Абуджэнне ў чалавеку духоўнага пачатку, дапамога яму ва ўсведамленні сябе асобай непаўторнай, выхаванне ў ім пачуцця дабраты да сябе падобных — гэта справа першаснай важнасці, — сказаў Уладыка Філарэт. — Будзе ў душы чалавечай мір і парадак — будзе добрапрыстойна і ў нашым грамадстве.

Сёлета фестываль пашырае сваю геаграфію: акрамя сталічных храмаў і канцэртных пляцовак ён пройдзе ў Клецку, Нясвіжы, Жодзіне, Бабруйску, Міханавічах. У рамках фестывалю адбудзецца навуковая канферэнцыя «Знаходжанне вобраза: духоўны вопыт і адкрыцці рэстаўратараў». Усе канцэрты, акрамя тых, якія пройдуць у залах Белдзяржфілармоніі, з'яўляюцца дабрачыннымі — уваход на іх вольны.

Адкрыецца фестываль Літургіяй у Кафедральным саборы Мінска, пасля якой сталіцу і гарады-ўдзельнікі напоўніць саборны звон галоўных храмаў. У сераду, 18 красавіка, у Канцэртнай зале Белдзяржфілармоніі на канцэрце адкрыцця фестывалю выступяць ансамбль царкоўнаслужыцеляў «Срэценне» (Кіеў) і Дзяржаўны камерны хор Рэспублікі Беларусь. За гадзіну да гэтага, на прыступках філармоніі, адбудзецца канцэрт званоў, які зможа пачуць кожны, хто пажадае. Такі ж званарны канцэрт стане прэлюдыяй і да гала-канцэрта з удзелам лаўрэатаў і дыпламантаў Фестывалю, які таксама адбудзецца ў Белдзяржфілармоніі, але ўжо падчас закрыцця фестывалю — 22 красавіка.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

УДАКЛАДНЕННЕ

## Маланаселеныя раёны не ліквідуюцца

У нумары за 3 сакавіка быў змешчаны матэрыял «Генплан Беларусі кардынальна зменіць аблічча краіны», у якім, у прыватнасці, гаварылася, што, «згодна з генеральным планам, Хоцімскі, Круглянскі, Брагінскі, Краснапольскі, Дрыбінскі, Кармянскі, Чэрыкаўскі, Нараўлянскі і іншыя раёны плануецца рэарганізаваць», аднак, як удакладнілі нам спецыялісты навукова-праектнага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «БелНІІПгорадабудаўніцтва», гаварыць катэгарычна аб рэарганізацыі пакуль рана. Указам кіраўніка дзяржавы «Аб некаторых пытаннях дзяржаўнай палітыкі» зацверджана «Дзяржаўная схема комплекснай тэрытарыяльнай арганізацыі Рэспублікі Беларусь». У гэтым дакуменце прадугледжана, што ў ходзе далейшай аптымізацыі функцыянальна-планіровачнага раяніравання Рэспублікі Беларусь «падлягае прапрацоўцы мэтазгоднасць ліквідацыі раёнаў, колькасць насельніцтва якіх менш за 15 тысяч чалавек і працягвае змяншацца». Таму ўсе названыя раёны ў бліжэйшай перспектыве застаюцца ў структуры адпаведных абласцей.


## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ОАО «ЗАВОД «ПРОДМАШ» ЗА 2006 ГОД

(млн. руб.)

| АКТИВ | Код строки | На конец отчетного периода |
|---|---|---|
| Основные средства (01, 02) | 110 | 2227 |
| Вложения во внеоборотные активы (07, 08) | 140 | 1 |
| Запасы и затраты | 210 | 164 |
| Налоги по приобретенным ценностям (18, 76) | 220 | 2 |
| Готовая продукция и товары (40, 41, 43) | 230 | 152 |
| Товары отгруженные, выполненные работы, оказанные услуги (45, 46) | 240 | 48 |
| Дебиторская задолженность | 250 | 12 |
| Денежные средства (50, 51, 52, 55, 57) | 270 | 175 |
| БАЛАНС | 390 | 2781 |
| **ПАССИВ** | | |
| Уставный фонд (80) | 510 | 1632 |
| Резервный фонд (82) | 520 | 7 |
| Добавочный фонд (83) | 530 | 738 |
| Нераспределенная прибыль (84) | 540 | 94 |
| Расходы будущих периодов (97) | 620 | -6 |
| Кредиторская задолженность | 730 | 316 |
| БАЛАНС | | 2781 |

## ОАО «ЗАВОД «ПРОДМАШ» ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ С 1 ЯНВАРЯ 2006 Г. ПО 31 ДЕКАБРЯ 2006 Г.

(млн. руб.)

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный год |
|---|---|---|
| I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 1804 |
| Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 020 | 306 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) (010-020) | 030 | 1498 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 040 | 1278 |
| Прибыль (убыток) от реализации (030-040-050-060) | 070 | 220 |
| II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ Операционные доходы | 080 | 65 |
| Налоги, включаемые в операционные доходы | 090 | 2 |
| Операционные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных платежей) (080-090) | 100 | 63 |
| Операционные расходы | 110 | 63 |
| III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ Внереализационные доходы | 140 | 6 |
| Внереализационные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных платежей) (130-140) | 160 | 6 |
| Внереализационные расходы | 170 | 41 |
| Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (160-170+180) | 190 | -35 |
| Прибыль (убыток) за отчетный период (070+130+190) | 200 | 185 |
| Налоги и сборы, производимые из прибыли | 210 | 78 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) К РАСПРЕДЕЛЕНИЮ (200-210-220-230) | 240 | 107 |

## ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОАО «ЗАВОД «ПРОДМАШ» ЗА 2006 ГОД

| | | |
|---|---|---|
| 1. Количество акционеров, всего | чел. | 14 |
| в том числе — юридических лиц | | 1 |
| физических лиц | чел. | 13 |
| 2. Начислено на выплату дивидендов | млн. руб. | 6,1 |
| 3. Дивиденды, приходящиеся на 1 акцию | руб. | 15,78 |
| 4. Обеспеченность акции имуществом общества | млн. руб. | 6 |
| 5. Количество простых акций, находящихся на балансе общества | шт. | 388671 |
| 6. Просроченная дебиторская задолженность | млн. руб. | 44 |
| 7. Просроченная кредиторская задолженность | млн. руб. | 17 |
| 8. Среднесписочная численность | чел. | 76 |

Директор Н.Д. Щетинко
Главный бухгалтер Л.М. Потапенко


# НІХТО НЕ ЦЭНІЦЬ ЖЫЦЦЁ ТАК, ЯК ЯНЫ



Фота Ксеніі НАРУШЭВІЧ.

*Ларыса ГРЫБАЛЁВА раздае аўтографы пацыентам цэнтра дзіцячай анкалогіі і гематалогіі.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адкрылася прэзентацыя прамовай дырэктара цэнтра — Вольгі Алейнікавай:

— У гэтым зборніку — боль вашай душы, ваша бачанне свету, — сказала яна, звяртаючыся да дзяцей. — І мы на гэтым не спынімся. Колькі існуе чалавецтва, столькі існуе творчасць. Думаю, некалі ваш творчы калектыў прымуць у Саюз пісьменнікаў! Ужо другая кніга запар адкрываецца вершамі ўсімі намі любімай Веры Максімаўны (сястры са СвятаМарфа-Марыінскага сястрыцтва. — **Заўв.аўт.**) — без яе цэнтр ужо немагчыма ўявіць! А прачытаць я хацела б верш Наташы Сухадолавай — дзяўчынкі, якой, на жаль, ужо няма... Яно завяршае зборнік і нібы канцэнтруе ўсё сказанае там.

І ведаеце, што мяне ўразіла ў гэтым вершы? Хворая дзяўчынка не скардзілася на лёс, не жалілася, якая яна гаротная, а пісала «як хораша на свеце жыць!». Чаму мы, здаровыя і шчаслівыя, не цэнім гэтага?! А Наташа сказала, што шчасце яе і іншых дзетак у тым, што ёсць лекі і ўрачы, якія выратоўваюць іх...

Кожнаму выступоўцу хворыя дзеткі ўручалі падарункі, зробленыя сваімі рукамі. Яны падымаліся на сцэну з дапамогай дактароў і сясцёр, але ў іх вачах свяцілася радасць...

* * *

Выступіла таксама Ларыса Уладзіміраўна Кузікова — аўтар ідэі стварэння такога зборніка і сацыяльны педагог цэнтра:

— Зборнік «Бераг надзеі» выходзіць у рамках праекта «Дрэва жыцця» — сумеснай акцыі навукова-практычнага цэнтра дзіцячай анкалогіі і гематалогіі і выдавецтва «Зорны верасень». Яго таксама падтрымліваюць многія людзі і арганізацыі: Тамара Лісіцкая (тэлевядучая, дарэчы, вяла прэзентацыю. — **Заўв. аўт.**) і запрошаныя ёю зорныя калектывы, грамадская дабрачынная арганізацыя «Дзеці ў бядзе», англійская асацыяцыя «Падтрымка дзецям Беларусі».

Выступіла перад аўтарамі і дырэктар выдавецтва «Зорны верасень» Алена Паўлава:

— З намі, на жаль, няма Дзімы Макаранкі, але мы выпусцілі дыск, на якім ёсць яго песня «Анёльскае святло» — яна стане гімнам усіх дзетак анкалагічнага цэнтра. Усе нашы маленькія аўтары ўжо з'яўляюцца членамі дзіцячага творчага аб'яднання «Дрэва жыцця». Мы нават трапілі пад патранаж Саюза пісьменнікаў. Наш зборнік мы выставілі на 10-й Рэспубліканскай навукова-педагагічнай канферэнцыі, і паводле рашэння Міністэрства адукацыі яму быў прысуджаны дыплом другой ступені за выхаванне грамадзянскасці і патрыятызму ў навучэнцах і моладзі.

Гэтым самым сапраўдным і самым шчырым аўтарам уручалі зборнікі, кветкі і ганарары. Усе прысутныя маглі дадаць нешта ў скарбонку, набыўшы зборнікі, якія прадаваліся проста ў фае. Для гасцей юныя аўтары агучвалі свае творы: Саша Паўлоўская прысвяціла палкі і пранікнёны верш матулі, Люда Бегляцова прызналася са сцэны ў каханні, Лена Бурак заклікала нас думаць пра добрае, Оля Старавойтава прачытала сваё чулліваe апавяданне пра сабаку, які цудам папраўіўся, а Іра Белазорава не ў стане падняцца на сцэну, таму яе казку чытала валанцёрка з клуба «Міласэрнасць» Каця...

* * *

Актавая зала анкалагічнага цэнтра была напоўнена пацыентамі — схуднелымі, безвалосымі, закрытымі ад знешняга свету рэспіратарамі і прымацаванымі да крапельніц — проста дзецьмі, якім так хочацца свята, радасці, шырокіх усмешак і бесклапотнага смеху. Для іх падрыхтавалі шмат забаў: фокусы дзецям паказваў напалову клоун, напалову ілюзіяніст Эрык Гротэр (такая вось гульня з імем Гары Потэра), а спявалі — Зміцер Вайцюшкевіч і Ларыса Грыбалёва.

Сапраўдны цуд адбыўся з Косцікам Сотнікам: збылася яго мара — ён пазнаёміўся з удзельнікамі свайго любімага гурта «Нестандартны варыянт». Пасадзейнічала гэтаму Тамара Лісіцкая:

— Аднойчы, калі хлопчыку было асабліва складана, я зайшла да яго ў палату і спыталася: «Косця, чаго ты хочаш больш за ўсё?», а ён не за сябе папрасіў — сказаў: «Хачу, каб усе дзеці слухаліся сваіх бацькоў». Гэта мяне настолькі ўразіла! А потым я неяк выпадкова даведалася, што ён вялікі аматар гурта «Нестандартны варыянт»... і вось сёння яны завіталі да нас у госці, да цябе, Косця!

* * *

Больш за ўсё ўразіла выступленне Алены Віктараўны Пацееўскай — маці Юлечкі, якая не так даўно пайшла з жыцця... Я зараз пішу і шкадую... не, не гэту мужную жанчыну і не яе дачку — ні тая, ні другая не маюць патрэбы ў тым, каб іх шкадавалі... шкадую, што я не мастак ці музыкант, бо словамі мне вельмі цяжка выказаць тыя адчуванні, якія выклікала выступленне маладой жанчыны, што страціла маленькую дачку. Здаецца, мала хто на яе месцы адшукаў бы ў сабе сілы выйсці на сцэну і адкрыць душу перад чужымі людзьмі. Алена Віктараўна чытала Юліны вершы, прысвечаныя супрацоўнікам цэнтра. Маці ніводнага разу не сказала, што дачка «памерла»... «Мы з Юляй рассталіся», — кажа яна.

— За сем гадоў нашага лячэння мая дзяўчынка мяне вельмі многаму навучыла і я ўдзячная Богу за тое, што ён даравала нам такое шчасце — быць яе бацькамі...

Алена Віктараўна мае рацыю — нам варта вучыцца ў гэтых дзетак... вучыцца стойкасці, цярплівасці, жыццялюбству. Жыць і цаніць жыццё.

**Ала МАЧАЛАВА.**


## Годовой отчет эмитента

### Открытое акционерное общество «БЕЛФА» г. Жлобин
### Гомельская обл., г. Жлобин, Красный проезд, 2

### Годовой баланс ОАО «БЕЛФА» на 01.01 2007 г.

| Актив | млн. руб | Пассив | млн. руб. |
|---|---|---|---|
| 1. Основные средства, внеоборотные активы | 46772 | 1. Уставный фонд | 192 |
| 2. Запасы и затраты | 7944 | 2. Фонды, нераспредел. прибыль | 61826 |
| 3. Дебиторы | 1026 | 3. Кредиты банка | 201 |
| 4. Денежные средства | 3907 | 4. Кредиторская задолженность | 3239 |
| 5. Прочие активы | 5809 | 5. Прочие пассивы | |
| Баланс | 65458 | Баланс | 65458 |

### Отчет о прибылях и убытках ОАО «БЕЛФА» за 2006 год

млн. руб.

| Наименование показателей | За 2006 год | За 2005 год |
|---|---|---|
| 1. Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и аналогичных обязательных платежей) | 58824 | 51230 |
| 2. Себестоимость реализации товаров, продукции, работ, услуг | 49545 | 43122 |
| 3. Расходы на реализацию | 1167 | 948 |
| 4. Прибыль от внереализационных, операционных доходов и расходов | -2168 | -149 |
| 5. Прибыль за отчетный период | 5944 | 7011 |
| 6. Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли | 2408 | 2285 |
| 7. Нераспределенная прибыль | 3536 | 4726 |

### Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности

1. Количество акционеров, всего – 5563, в т.ч. юридических лиц – 3, физических лиц – 5560
2. Информация о дивидендах и акциях

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн. руб. | 283 | 270 |
| Дивиденды, приходящиеся на 1 акцию (включая налоги) | рублей | 103 | 99 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тыс. руб. | 20,5 | 17,1 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | - | - |

3. Информация о задолженности

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Просроченная дебиторская задолженность | млн. руб. | 0 | 0 |
| Просроченная кредиторская задолженность | млн. руб. | 0 | 0 |

4. Среднесписочная численность работающих (чел.) — 1552
5. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено 94,7% выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг:
-трикотажное полотно (искусственный мех);
-изделия из трикотажного полотна (искусственного меха).

